*В. М. Бігеза*

# АДМЕТНАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ ДА КУЛЬТУРНА-АДПАЧЫНКАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Павышэнне ролі адукацыі і культуры ў XXI ст. абумоўліваюць высокія патрабаванні да прафесіяналізму спецыялістаў сферы культуры. Адпаведна сучасныя патрабаванні да ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў прадугледжваюць павышэнне якаснага ўзроўню сістэмы адукацыі на падставе захавання фундаментальнасці навучання, адпаведнасці перспектыўным патрэбнасцям асобы, грамадства і дзяржавы. Пэўныя захады ў гэтым кірунку робяцца і адносна падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі ў рамках факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Сёння ў аснову падрыхтоўкі такога спецыяліста пакладзены кампетэнтнасны падыход, які прадугледжвае вызначэнне ведаў, уменняў, вопыту выпускніка, якія неабходны для вырашэння тэарэтычных і практычных задач. Кампетэнтнасць выпускніка вызначаецца як выражаная здольнасць прымяніць свае веды і ўменні (СТБ ИСО 9000). У лік кампетэнтнага вырашэння прафесійных задач выпускніка ВНУ ўваходзіць і ажыццяўленне культурна-адпачынкавай дзейнасці як састаўляючай сацыякультурнай дзейнасці ва ўмовах бібліятэкі.

У наш час падрыхтоўка спецыяліста на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь (2008 г.) [1] павінна забяспечваць фарміраванне наступных груп кампетэнцый: акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных.

Агульныя мэты падрыхтоўкі спецыяліста сёння прадугледжваюць і развіццё спецыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, дазваляючай спалучаць акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці.

Неабходна падкрэсліць, што вырашэнне прафесійных задач выпускніка ВНУ дасягаецца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў праз вывучэнне цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, цыкла агульнапрафесійных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацыі, якія вызначаны ў вучэбным плане па падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў, у тым ліку і бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі.

Вывучэнне названых цыклаў дысцыплін садзейнічае фарміраванню вышэйадзначаных кампетэнцый. Калі першы цыкл дысцыплін садзейнічае назапашванню ведаў для арыентацыі ў жыцці сусвету, то спецыяльныя дысцыпліны садзейнічаюць базавай падрыхтоўцы ў прафесійнай сферы. Дысцыпліны спецыялізацыі садзейнічаюць паглыбленню тэарэтычнага і практычнага патэнцыялу зместу відаў прафесійнай дзейнасці адносна шматвектарнай працы з пэўнымі групамі карыстальнікаў. Прыкладам таму з'яўляецца падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі на спецыялізацыі «бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва». Падрыхтоўцы гэтага спецыяліста ў аспекце культурна-адпачынкавай дзейнасці, безумоўна, будзе садзейнічаць аваloданне такой прафесійнай кампетэнцыяй, як сацыяльна-культурная. Пры яе рэалізацыі выпускнік павінен быць здольны ўстанаўліваць і падтрымліваць прадукцыйныя сувязі з рознымі грамадскімі інстытутамі (сям'я, школа, установы культуры, установы адукацыі і інш.) з мэтай фарміравання спецыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю; распрацоўваць і рэалізоўваць мэтавыя сацыякультурныя праграмы і праекты; ажыццяўляць задавальненне патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэкі праз арганізацыю інфармацыйна-асветніцкай, культурна-творчай, культурна-адпачынкавай і рэкрэацыйна-аздараўленчай дзейнасці; ствараць пры неабходнасці ў бібліятэцы арганізацыйныя фарміраванні, накіраваныя на рэалізацыю яе сацыяльна-культурнай функцыі: музеяў, інтэрнэт-цэнтраў, цэнтраў прававой інфармацыі, цэнтраў культур народаў і краін і інш., распрацоўваць сцэнарыі і ажыццяўляць рэжысуру культурна-масавых мерапрыемстваў.

Паняційнае тлумачэнне самога тэрміна «культурна-адпачынкавая дзейнасць» шматграннае. Улічваючы, што культурна-адпачынкавая дзейнасць з'яўляецца працэсам стварэння, распаўсюджвання і памнажэння духоўных каштоўнасцей, мы больш пагаджаемся з вызначэннем, дадзеным Н.Ф. Максюціным. Ён лічыць, што «культурна-адпачынкавая дзейнасць ёсць спецыялізаваная падсістэма духоўна-культурнага жыцця грамадства, функцыянальна аб'ядноўваючая сацыяльныя інстытуты, прызваныя забяспечыць распаўсюджванне духоўна-культурных каштоўнасцей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх актыўнае творчае засваенне людзьмі ў сферы вольнага часу ў мэтах фарміравання гарманічнага развіцця творча актыўнай асобы» [5, с.21].

Як вядома, сёння ў культурна-адпачынкавай дзейнасці ўдзельнічаюць шматлікія ўстановы, аднак менавіта бібліятэка з'яўляецца найгалоўнейшым сацыяльным інстытутам, у якім адбываецца выхаванне духоўнасці дзяцей, падлеткаў, моладзі, дарослых праз далучэнне да агульначалавечых каштоўнасцей, гуманістычных ідэалаў. І гэта, безумоўна, вымагае шматграннай падрыхтоўкі будучага спецыяліста па рабоце з дзецьмі. Адной з адметнасцей такой падрыхтоўкі з'яўляецца гатоўнасць да працы па сацыяльным выхаванні дзяцей, падлеткаў, значнасць якой сфармуліравана ў рэзалюцыі «Міжнароднае дзесяцігоддзе культуры ненасілля і міру ў інтарэсах дзяцей планеты (2001–2010)», прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН (2000). Сацыяльнае выхаванне разглядаецца навукоўцамі як сістэма, якая педагагічна арыентавана і мэтазгодна накіравана на грамадскую дапамогу названым катэгорыям у перыяд іх уваходжання ў сацыяльнае жыццё. І тут, на наш погляд, важна сфарміраваць у студэнтаў сацыяльнае мысленне, якое паводле вызначэння К. А. Абульханавай-Слаўскай «з'яўляецца састаўной часткай суб'ектнасці чалавека, яго "жыццёвых сіл", яго здольнасці да эмацыянальна-валявой самарэгуляцыі, самасцвярджэння, праектавання свайго асобаснага росту» [2]. Фарміраванне сацыяльнага мыслення можа адбывацца праз вывучэнне шэрагу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, праз удасканальванне методыкі навучання і ўкараненне прынцыпу практычнай накіраванасці навучання.

Пры падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў у сферы вольнага часу неабходна ўлічваць той факт, што свабодны выбар адпачынкавых заняткаў пэўным індывідам у значнай ступені абумоўліваецца асобаснай накіраванасцю, псіхолага-педагагічнымі, інтэлектуальнымі асаблівасцямі і таму ўсё большую актуальнасць набывае праблема зместу вольнага часу. На сучасным этапе адметнасцю падрыхтоўкі будучых бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі з'яўляецца, на нашу думку, авалодванне імі комплексам «Дзіцячая літаратура», які ўключае «Сусветную літаратуру для дзяцей і юнацтва», «Беларускую літаратуру для дзяцей», «Навукова-пазнавальную літаратуру для дзяцей і юнацтва». Комплекс не толькі далучае будучых бібліятэкараў да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульначалавечых каштоўнасцей, садзейнічае гуманізацыі асобы, але і дазваляе авалодаць літаратурна-педагагічным аналізам твора, які адначасова прадугледжвае крытэрыі эстэтычных каштоўнасцей і актывізацыю розных сфер чытацкага ўяўлення.

Своеасаблівай адметнасцю ў падрыхтоўцы вышэйназваных спецыялістаў з'яўляецца педагагічная падрыхтоўка. Як вядома, педагагічны працэс у сферы вольнага часу ўяўляе сабой мэтанакіраваную арганізацыю адпачынкавай дзейнасці, планамерны перавод яе на больш высокі ўзровень. Менавіта педагагічная сутнасць бібліятэкараў, якія працуюць з дзецьмі, патрабуе глыбокага ведання псіхалогіі чалавека, асноўных тэндэнцый індывідуальна-псіхалагічных адрозненняў, асаблівасцей псіхолага-педагагічнага развіцця дзяцей, а таксама псіхалогіі зносін, псіхолага-педагагічнага ўздзеяння кнігі і чытання на чытача, а таксама сацыяльнай псіхалогіі. Менавіта таму, на нашу думку, побач са спецыяльнымі вядучую ролю павінны адыгрываць псіхолага-педагагічныя веды і ўменні. Для іх набыцця студэнтам спецыялізацыі «бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва» мэтазгодна вывучаць не толькі агульныя курсы педагогікі і псіхалогіі, але, па-нашым меркаванні, арганізацыя ўсяго вучэбнага працэсу павінна быць пабудавана на імкненні да інтэграцыі выкладання псіхолага-педагагічных, агульнагуманітарных і спецыяльных дысцыплін. У гэтых мэтах выкладчыкі могуць распрацоўваць інтэграваныя курсы, спецкурсы, індывідуальныя вучэбна-даследчыя заданні, якія раскрываюць для студэнтаў сутнасць абранай прафесіі, а таксама дапамогуць камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста.

Мэтазгодна, на наш погляд, пры правядзенні заняткаў вывучыць стан і класіфікацыю электронных гульняў у вольны час, магчымасці іх выкарыстання ў тым ці іншым кірунку адпачынкавай дзейнасці.

У наш час сістэма адукацыі ў пэўнай ступені з'яўляецца асноўным сродкам развіцця этнічных традыцый, задавальнення этнакультурных патрэбнасцей дзяцей і моладзі, далучэння іх да этнакультурнага вопыту. Значнасць падрыхтоўкі бібліятэчнага спецыяліста па рабоце з дзецьмі ў гэтым аспекце культурна-адпачынкавай дзейнасці бясспрэчная. Яна прадастаўляе магчымасці па выяўленні, захаванні, распаўсюджванні, трансляцыі культурных каштоўнасцей, назапашаных грамадствам, засваення сацыяльна-культурнага вопыту папярэдніх пакаленняў і фарміраванне асабістай сістэмы каштоўнасцей. Актуалізацыя такой падрыхтоўкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відавочная: Генеральнай Асамблеяй ААН 2010 год аб'яўлены Міжнародным годам збліжэння культур.

Паляпшэнню практычнай падрыхтоўкі студэнтаў спецыялізацыі, у тым ліку і ў галіне культурна-адпачынкавай дзейнасці, садзейнічае функцыянаванне вучэбна-вытворча-навуковага комплексу «кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы БДУ культуры і мастацтваў – Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя М. А. Астроўскага», палажэнне аб стварэнні якога распрацавана на вышэйназванай кафедры ФІДК.

Адначасова неабходна падкрэсліць, што эфектыўнасць падрыхтоўкі спецыяліста бібліятэчнай справы ў значнай ступені залежыць ад самастойнай работы студэнтаў (СРС). Яна разглядаецца сёння ў ВНУ як абавязковая базавая складаючая прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў. На нашу думку, адносна падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне культурна-адпачынкавай дзейнасці, яна павінна насіць комплексны характар. Мы пагаджаемся з меркаваннем П. Г. Кулагіна, які лічыць, што «ўзаемасувязь з сумежнымі прадметамі пры самастойнай рабоце асабліва садзейнічае прывіццю навыкаў і ўменняў параўноўваць, аналізаваць, абагульняць» [4, с.62].

У вырашэнні задач прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў значнае месца належыць вытворчай практыцы. На факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый надаецца шмат увагі яе арганізацыі: распрацавана канцэпцыя вучэбнай і вытворчай практыкі ў кантэксце асноўных палажэнняў адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь на працягу ўсяго тэрміну навучання студэнтаў; скразная праграма практыкі дыферэнцыравана па курсах з улікам спецыялізацый. Вучэбны працэс і вытворчая практыка – бесперапынныя ў фарміраванні прафесійнага майстэрства бібліятэкараў, якія абслугоўваюць дзяцей. Што тычыцца аспекту культурна-адпачынкавай падрыхтоўкі студэнтаў спецыялізацыі ў час вытворчай практыкі, то падставай для яго развіцця з'явіцца ўдзел студэнтаў у выкананні плана работы бібліятэкі па правядзенні масавых і комплексных мерапрыемстваў, ажыццяўленні пастаноўкі культурна-адпачынкавых праграм.

Такім чынам, вучэбны працэс і практычная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі менавіта ў аспекце культурна-адпачынкавай дзейнасці (і не толькі) – бесперапынныя ў фарміраванні іх прафесіяналізму, а гэта, у сваю чаргу, вымагае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковы і метадычны пошук супрацоўніцтва, а з боку ВНУ – пошук новых сучасных прыёмаў навучання, сродкаў і спосабаў развіцця творчага мыслення студэнтаў.


*1. ОС РБ* 1 – 23 01 11 – 2008 Вышэйшая адукацыя. Першая ступень = Высшее образование. Первая ступень: спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках): кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф. – Узамен стандарту РД РБ 02100.5.211–98; уведз. 2008.12.06 №50. – Мінск: Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2008. – 38 с. – (Адукацыйны стандарт Рэсп. Беларусь).

*2. Абульханова-Славская, К. А.* Проблемы исследования индивидуального сознания / К. А. Абульханова-Славская, М. И. Воловикова, В. А. Елисеев // Психологический журнал. – 1991. – №4. – Т. 12. – С. 27–40.

*3. Жук, О. Л.* Компетентностный подход в высшем профессиональном образовании / О. Л. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 41–48.

*4. Кулагин, П. Г.* Межпредметные связи в процессе обучения / П. Г. Кулагин. – М., 1981. – С. 62–71.

*5. Максютин, Н. Ф.* Культурно-досуговая деятельность / Н. Ф. Максютин. – Казань, 1995. – С. 21–39.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ